# МИРОВОЙ И ОТЕЧЕСТВЕННЫЙ ОПЫТ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЕЙ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ

## ЗНАЧЭННЕ МЕТАДЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯКУБА КОЛАСА

*Белавус В.М.,*
*Лазарчык Н.В.,*
*Ваўкавыскі каледж УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», г. Ваўкавыск*

Анатацыя. У дадзеным артыкуле разглядаецца пытанне значэння метадычнай спадчыны Якуба Коласа. Прадэманстраваны пытанні і заданні на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, якія звязаны з вывучэннем творчасці класіка і якія ілюструюць метадычныя погляды пісьменніка. Выяўлена і патлумачана актуальнасць метадычных набыткаў Якуба Коласа.

*Ключавыя словы: крытычнае мысленне, метадычныя погляды, арфаграфічныя ўменні і навыкі, пазнавальныя інтарэсы.*

Якуб Колас – народны пісьменнік Беларусі, педагог, аўтар першай методыкі пачатковага навучання беларускай мове, роднае слова лічыў той крыніцай, з якой пачынаецца жыццё, навакольны свет, таму што гэта – крыніца жыцця адукацыі, чалавечага розуму і што вельмі важна – пачуццяў. Коласаўскія погляды на выхаванне, на выкладанне роднай мовы і літаратуры, як вядома, увасоблены ў трылогіі «На ростанях», «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», «Методыца роднай мовы».

Аб’ектам дадзенага даследавання стала метадычная спадчына Якуба Коласа, прадметам – выкладанне беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковай школе ў свеце метадычных набыткаў класіка. Даследаванне прадугледжвае рэалізацыю наступных мэт:

- прааналізаваць сістэму метадычных поглядаў Якуба Коласа;
- выявіць узровень ведання, разумення і валодання метадычнай спадчыны творцы навучэнцамі каледжа;
- прадэманстраваць прыёмы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковай школе з улікам метадычнай канцэпцыі пісьменніка.

Педагагічныя дзейнасць у жыцці і творчасці Канстанціна Міхайлавіча мела істотнае значэнне: ён быў самаахвярна аддадзены школе. Пасля заканчэння Нясвіжскай семінарыі з першых дзён настаўніцкай дзейнасці Канстанцін Міхайлавіч сваё галоўнае прызначэнне як настаўніка бачыць у тым, каб абудзіць у вучняў і выклікаць да дзеяння крытычны розум, зацікаўленасць да з’яў прыроды, грамадства. Менавіта ў гэтым абуджэнні крытычнай думкі бачыў ён пачатак вялікіх сацыяльных зрухаў, шлях да

новых форм жыцця. Гэты прынцып стаў адным з вызначальных у створанай ім пазней метадычнай сістэме.

Настаўніцкую дзейнасць Якуб Колас актыўна спалучаў з грамадскай: ён быў прапагандыстам народнай асветы. Сувязь з народам, з вучнёўскай моладдзю садзейнічала не толькі фарміраванню грамадзянскай і палітычнай пазіцыі, але і станаўленню яго педагагічных і метадычных поглядаў.

Коласаўскія погляды на выхаванне, на выкладанне роднай мовы і літаратуры, якія ўвасоблены ў «Другім чытаннні для дзяцей беларусаў», не страцілі сваёй каштоўнасці і на сённяшні дзень, бо яны накіраваны на фарміраванне ў юных чытачоў грамадзянскай актыўнасці, высокіх духоўных і маральных якасцей. Абагульненнем асноўных прынцыпаў Коласа-метадыста з’явілася «Методыка роднай мовы», якая ў 1926 годзе выйшла з друку. Гэта быў першы ў Беларусі падручнік, які раскрываў прынцыпы навучання роднай мове. Заслуга Якуба Коласа ў тым, што ён сістэматызаваў і абагульніў тое каштоўнае, што выказвалася ў педагагічнай літаратуры ў галіне методыкі пачатковага навучання.

Ён быў аднадумцам многіх беларускіх настаўнікаў, метадыстаў, быў «паслядоўнікам ідэй не толькі К. Д. Ушынскага, але і Яна Амоса Каменскага, вялікага чэшскага педагога, які лічыў, што на роднай мове лепш і хутчэй засвойваюцца ўсе прадметы ў школе. Для Якуба Коласа, як і для Яна Амоса Каменскага і К. Д. Ушынскага, родная мова была магутным сродкам развіцця індывіда. Роднае слова ён лічыў той крыніцай, з якой пазнаецца навакольны свет, жыццё, таму што гэта – крыніца адукацыі, чалавечага розуму, пачуццяў. Чужую мову можна вывучыць і нават думаць на ёй, а вось адчуваць – толькі на роднай» [1, с. 204]. Асабліва падкрэсліваў ён ролю роднага слова ў выхаванні ў дзяцей патрыятычных пачуццяў, вернасці свайму краю і любові да мовы. Заслуга Якуба Коласа як метадыста і ў тым, што ён даў у сваёй кнізе педагагічнае і псіхалагічнае абгрунтаванне неабходнасці прымянення нагляднасці на ўроках, бо гэта садзейнічае развіццю мовы вучняў.

Пры вывучэнні верша «Песня аб вясне» Якуба Коласа ў 3-м класе можна спытаць у дзяцей, з дапамогай якіх слоў паэт паказвае мароз як жывую істоту. Неабходна дэманстраваць ілюстрацыі да гэтых слоў. Такі прыём будзе спрыяць лепшаму засваенню лексікі.

Важную ролю ў працэсе навучання роднай мове аўтар «Методыкі роднай мовы» адводзіць настаўніку, які бачыўся яму асобай творчай, інтэлігентнай, высакароднай. На думку Якуба Коласа, самае галоўнае – які настаўнік прыйдзе ў школу: раўнадушны і абыякавы да гэтай адказнай і высакароднай справы ці па-сапраўднаму зацікаўлены сваёй прафесіяй спецыяліст, духоўна багатая асоба. Сёння школе патрэбен настаўнік найвышэйшага прафесіяналізму, інтэлектуал, яркая і самабытная асоба.

Асаблівасцю працы настаўніка, на думку Якуба Коласа, з'яўляецца цесная сувязь урокаў мовы з выкладаннем літаратуры, бо найчасцей педагагічныя задачы ў аднолькавай ступені належаць да сферы мовы і літаратуры. Вялікае значэнне ў працэсе навучання гэтым дысцыплінам вялікі педагог надаваў эмацыянальнаму фактару.

Пры вывучэнні тэмы «Клічныя сказы» ў 3-м класе можна прапанаваць вучням наступнае заданне: пераставіць радкі, каб атрымаўся верш.

*Мілы кут маіх дзядоў!*
*О, край родны, край прыгожы!*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Што мілей у свеце божым (Якуб Колас).*

Якуб Колас падкрэсліваў ўзаемасувязь вусных і пісьмовых практыкаванняў, ён адзначыў, што развіццё вуснай мовы мае вялікае значэнне для выпрацоўкі ўмення выказваць уласныя думкі.

Метадыст падкрэсліваў, што нельга прыступаць да самастойнага пісьма пры адсутнасці арфаграфічных навыкаў, бо пры такой умове вучні будуць дапускаць памылкі ў самастойных работах. Педагог раіў сфарміраваць элементарныя арфаграфічныя ўменні і навыкі і з першых жа крокаў прывучаць дзяцей да дакладнага выказвання сваіх думак. Пры гэтым Якуб Колас падкрэсліваў, што «невялкія, звязаныя, добра падабраныя тэксты вельмі патрэбныя і незаменныя пры навучанні арфаграфіі» [2, с. 449].

У сувязі з вышэй сказаным карысная будзе арфаграфічная хвілінка ў 4-м класе, для якой прапануецца ўрывак з апавядання Я.Коласа «Вясна»: «Які пекны, сла(у, ў)ны дз(е, я)нёк! Вый(д, дз)ем, дзеткі, на вуліцу, на Божы све(т, д). Паглядзім, паслухаем. Можа, чаму і навучыць нас гэты Божы свет». Неабходна выбраць і патлумачыць патрабуемыя арфаграмы. «Пры гэтым не толькі ўзнаўляюцца моўныя ўменні, але адбываецца фарміраванне маўленчых формул вучняў» [3, с. 47]. Важнейшую ролю настаўніка вялікі педагог бачыў у развіцці пазнавальных інтарэсаў дзяцей. Ён быў перакананы ў тым, што веды не павінны давацца вучням у гатовым выглядзе, самастойна сфармуляваныя высновы значна каштоўнейшыя, чым тыя, што даюцца ў гатовым выглядзе.

Пры вывучэнні тэмы «Прыметнік як часціна мовы» ў 3-м класе мэтазгодна прапанаваць наступнае заданне: уставіць прапушчанае слоўнікавае слова, скласці з ім сказ.

*Талька – слаўная рачулка,*
*Грунт яе ..,*
*Бераг мяккі, як падушка,*
*Дзірваном засланы (Якуб Колас).*

Метадычная і літаратурная спадчына Якуба Коласа ўяўляе для будучых настаўнікаў вялікую каштоўнасць. Каб высветліць актуальнасць дадзенай

праблемы, адносіны да яе навучэнцаў, было праведзена анкетаванне, у якім удзельнічалі 42 навучэнцы груп 1-41 і 1-42 спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» Ваўкавыскага каледжа.

Першае пытанне было наступным: «Назавіце імя выдатнага беларускага пісьменніка і педагога, пачынальніка методыкі беларускай мовы». 100 % рэспандэнтаў далі правільны адказ – Якуб Колас.

На другое пытанне «Як называўся першы ў гісторыі беларускай методыкі даведнік для настаўнікаў малодшых класаў, які выйшаў з друку ў 1926 г.?» правільны адказ – «Методыка роднай мовы» – далі 79 % навучэнцаў, а 21 % памыліўся.

Трэцяе пытанне гучала так: «Акрэсліце адну з самых важных праблем выкладання роднай мовы, якой значную ўвагу надаваў педагог-метадыст». Слушныя адказы сфармулявала пераважная большасць рэспандэнтаў – 71 %. Сярод іх наступныя: «Важнай праблемай методыкі роднай мовы Якуб Колас лічыў авалоданне словам, уменне выказвацца на роднай мове змястоўна і лагічна», «Вялікае значэнне надаваў Якуб Колас развіццю мовы вучняў», «Галоўны клопат Якуба Коласа як педагога і вучонага заключаўся ў тым, каб узняць на новы ўзровень выкладанне беларускай мовы і літаратуры».

На наступнае пытанне «Дакажыце, што метадычныя і навуковыя распрацоўкі Коласа не страцілі сваёй актуальнасці сёння» навучэнцы адказалі змястоўна і аргументавана: «Якуб Колас – шматгранная асоба, акадэмік, народны паэт Беларусі. Метадычнай і педагагічнай спадчынай педагога карыстаюцца пакаленні беларускіх настаўнікаў-практыкаў», «Мастацкія творы класіка вывучаюцца ў пачатковай школе. Выкарыстанне на ўроках мовы і літаратуры праблемнага пераказу, эўрыстычнай гутаркі дазваляе пашырыць кругагляд вучняў, спрыяе развіццю вуснай і пісьмовай мовы, фарміраванню умення рабіць абагульненні і вывады», «Выкарыстанне на ўроках дыдактычнага матэрыялу стварае ўмовы для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, пашырэння іх слоўнікавага запасу, развіцця звязнай мовы і арфаграфічнай пільнасці», «Педагагічныя ідэі Якуба Коласа знайшлі сваё адлюстраванне ў праграмах, падручніках і з’явіліся вызначальнымі ў метадычнай сістэме пачатковага навучання на сучасным этапе».

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы:

– метадычная сістэма Якуба Коласа стваралася з улікам перспектыў будучага, бо распрацаваныя ім тэарэтычныя палажэнні знайшлі сваю рэалізацыю ў праграмах, падручніках па беларускай мове і літаратурным чытанні, у метадычнай сістэме пачатковага навучання на сучасным этапе;
– пісьменнік аддаваў пальму першынства ў выхаванні ў дзяцей патрыятычных пачуццяў роднаму слову, падкрэсліваў цесную сувязь урокаў мовы з выкладаннем літаратуры для фарміравання пазнавальнай сферы дзяцей;

– адну з асноўных задач навучанню роднай мове ён бачыў у фарміраванні арфаграфічных навыкаў дзяцей;
– літаратурная спадчына Якуба Коласа служыць багатым падмуркам для рэалізацыі яго метадычных поглядаў;
– навучэнцы каледжа ведаюць асноўныя палажэнні педагагічнай канцэпцыі беларускага метадыста, разумеюць важнасць яго метадычнай спадчыны, выкарыстоўваюць яго ідэі на практыцы.

**Спіс літаратуры**


1. Жардзецкая, А. Значнасць метадычнайм спадчыны Якуба Коласа / А. Жардзецкая // Каласавіны. Асоба Якуба Коласа ў літаратурна-творчым і грамадска-культурным асяроддзі Беларусі: матэрыялы XXIII навук. канф., прысвеч. Вывучэнню грамадска-інтэлектуал. акружэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, 3 лістапада 2008 г., Мінск / склад. З.М. Камароўская, Г.І. Зайцава. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2009. – С. 202–205.
2. Колас, Я. Методыка роднай мовы / Я. Колас // 36. тв.: У 4 т. – Мінск, 1976. – Т. 12. – 598 с.
3. Мартынкевіч, С. В. Развіцце камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5-6 класы) : вучэб.-метад. дапаможнік / С. В. Мартынкевіч. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 102 с.


---

## ПРЕПОДАВАНИЕ ИНФОРМАТИКИ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ: ЗАРУБЕЖНЫЙ ОПЫТ


*Быкадоров Ю.А., кандидат физико-математических наук, доцент,*
*Шепелюк О.В.,*
*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка, г. Минск*



Аннотация. В статье приведен анализ учебных программ по информатике для начальных школ Республики Беларусь и анализ аналогичных программ других стран, которые обеспечивают преподавание информатики на уровне начального образования.



*Ключевые слова: преподавание информатики, начальная школа, зарубежный опыт.*


В Республике Беларусь основы информатики изучаются в 6–11 классах в рамках учебного предмета «Информатика».

В начальных классах республики до недавнего времени можно было использовать программу факультативных занятий «Развивающая информатика». Программа предполагала проведение внеурочных занятий в кабинетах информатики и информационных технологий (рабочие места учащихся обязательно оснащены наушниками) и была рассчитана на 34 часа в 1–2 классах и на 35 часов в 3–4 классах. В основе обучения лежало использование большого количества разнообразных обучающих программ. На 2018–2019 год данная учебная программа в перечень рекомендованных учебных программ для начальной школы не включена.

Перечень в настоящее время включает две программы факультативных занятий по информатике: «Творческая деятельность в среде программирования Scratch» и »Первые шаги в образовательную робототехнику